**ГАРЭЦКІ** Максім Іванавіч [18. 02. 1893, в. Малая Багацькаўка Мсціслаўскага павета – 20. 03. 1939], беларускі пісьменнік, літаратуразнавец і педагог.

Скончыў Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча (1913), працаваў землямерам у Віленскім уездзе. Першае апавяданне “У лазні” з’явілася на старонках газеты “Наша ніва” (1913). Першы зборнік “Рунь” выйшаў у 1914 г. У ранніх творах пісаў аб ролі інтэлігенцыі ў стварэнні нацыянальнай культуры. У час першай сусветнай вайны быў на фронце. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі супрацоўнічаў у газеце “Звязда”, з яе рэдакцыяй пераехаў у Вільню. Займаўся выдавецкай, навуковай і педагагічнай дзейнасцю. У Віленскай гімназіі і настаўніцкіх курсах выкладаў беларускую мову і літаратуру. Свой абавязак як выкладчык бачыў у тым, каб абудзіць у вучняў цікавасць да ведаў, любоў да роднай мовы і айчыны.

М. І. Гарэцкі з’яўляецца аўтарам “Гісторыі беларускай літаратуры” (1920), якая вытрымала некалькі выданняў і на працягу цэлага дзесяцігоддзя была адзіным падручнікам па беларускай літаратуры для вучняў і дапаможнікам для студэнтаў і настаўнікаў.

Для сярэдніх школ Заходняй Беларусі М. І. Гарэцкі падрыхтаваў і выдаў “Хрэстаматыю беларускай літаратуры. XI век – 1905 г.”. (1920).

М. І. Гарэцкі значны час працаваў у Інбелкульце, выкладаў беларускую мову і літаратуру на рабфаку Беларускага дзяржаўнага універсітэта і ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ